

Сустрэча чырвонаармейцаў з жыхарамі Заходняй Беларусі ў верасні 1939 года

# Вяртанне векапомнай даты

**У нядзелю Беларусь будзе адзначаць Дзень народнага адзінства. Ён быў зацверджаны 7 чэрвеня 2021 года Указам № 206 Кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі.**

**Дзень народнага адзінства, які святкуецца 17 верасня, прымеркаваны да пачатку паходу Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь у 1939 годзе. У выніку вызваленчай кампаніі наша нацыя зноў уз'ядналася. Якія таму папярэднічалі падзеі, як змагаліся беларусы і чаму гэтая дата такая важная для нас сёння?**

## НАКОНАДНІ ПАДЗЕІ

Падчас Рэспубліканскага семінара па пытаннях гістарычнай палітыкі і музейнай справы, што адбыўся ў жніўні ў Нацыянальнай бібліятэцы, генеральны дырэктар установы і старшыня праўлення Беларускага таварыства "Веды", кандыдат гістарычных навук **Вадзім Гігін** адзначыў, што абвяшчэнне Года народнага адзінства і ўсталяванне Дня народнага адзінства ў 2021-м — важны этап рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі. Эксперт падкрэсліў: такім чынам было выканана рашэнне Народнага Сходу Заходняй Беларусі, прынятае яшчэ ў кастрычніку 1939-га, — абвясціць 17 верасня святочным днём.




## НОВЫЯ ТРАДЫЦЫІ

На пачатку месяца ў сталічным Доме літаратара зладзілі круглы стол "Шляхі вялікіх выпрабаванняў", прымеркаваны да Дня народнага адзінства і прысвечаны гістарычным вытокам свята. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Саюз пісьменнікаў Беларусі, Інстытут гісторыі і Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук. У сустрэчы паўдзельнічалі беларускія даследчыкі мінуўшчыны, мовазнаўцы, пісьменнікі і выдаўцы.

Як адзначыў дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, кандыдат філалагічных навук **Ігар Капылоў**, Дзень народнага адзінства варта трактаваць у больш шырокім сэнсе, не толькі як гадавіну падзей 17 верасня 1939-га, бо тэма еднасці цягам усёй гісторыі была актуальнай для беларускай нацыі. Сёння наша дзяржава надае багата ўвагі патрыятычнаму выхаванню і зберажэнню духоўных каштоўнасцей, а прывіванне любові да радзімы немагчымае без ведання айчыннага мінулага, культуры, літаратуры і мовы. Мова — адзін з найважнейшых складнікаў нашай культуры і патрыятычнага выхавання. Менавіта роднае слова заўсёды служыла вызначальным фактарам, які садзейнічаў кансалідацыі народа, фарміраванню нацыі і ўмацаванню адзінства. Што тычыцца 1939 года, у Заходняй Беларусі на чатыры мільёны нашых суайчыннікаў не было ніводнай беларускай школы, вышэйшай навучальнай установы, бібліятэкі альбо тэатра, а беларускамоўныя газеты, калі і выходзілі, ліквідаваліся адразу пасля выпуску некалькіх нумароў. Усё было накіравана на тое, каб беларусы страцілі ідэнтычнасць.

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі **Аляксандр Карлюкевіч** падкрэсліў, што апошнім часам актывізавалася ўшанаванне памяці аб падзеях 1939 года. У рамках праекта "Бацькаўшчына. У пошуках страчанага" пабачыла свет кніга-альбом "17 верасня. Дзень народнага адзінства", укладзеная лаўрэатам прэміі "За духоўнае адраджэнне" Уладзімірам Ліхадзедавым. У выданні прадстаўлены фотаздымкі і дакументы, звязаныя з гісторыяй Заходняй Беларусі ў міжваенныя гады і яе далучэннем да Савецкага Саюза.

Кіраўнік Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі **Людміла Кебіч** дадала, што ў гэтым заходнім рэгіёне нашай краіны заўжды зберагаліся памяць аб уз'яднанні і цікаўнасць да спадчыны творцаў міжваеннага перыяду. Была адзначана і важная роля даследчыкаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта, супрацоўнікаў устаноў культуры — напрыклад, Дома Валянціна Таўлая ў Лідзе.

## АДРАСЫ ПАМЯЦІ

Літаратары міжваенных часоў — Міхась Васілёк, Піліп Пестрак, Максім Танк, Валянцін Таўлай — не толькі зберагалі родную мову, але і актыўна ўдзельнічалі ў барацьбе за нацыянальныя інтарэсы народа ў шэрагах Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, за што праследаваліся польскімі ўладамі і былі зняволены. Недарма ў адным з "давераснёўскіх" вершаў Максім Танк зазначаў, што "скрыпачоў і паэтаў" у яго краіне больш, чым каласоў. Заходняя Беларусь, нягледзячы на ўціск, з'яўлялася мясцінай сапраўднага росквіту нацыянальнага мастацтва, дзе жылі і працавалі, насуперак усім неспрыяльным абставінам, дзясяткі выдатных пісьменнікаў, жывапісцаў, кампазітараў і музыкантаў.

Сёння памяць аб тых творцах зберагаецца ў многіх кутках на захадзе краіны. У Пількаўшчыне Мядзельскага раёна, дзе нарадзіўся будучы народны паэт Беларусі Максім Танк, захавалася яго родная хата, якой ужо больш за сто гадоў, — сёння яна мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і адпаведную мемарыяльную шыльду. У суседніх Сватках, дзе паэт вучыўся, пры школе існуе прысвечаная яму музейная экспазіцыя. А ў Лідзе шануюць памяць аб Валянціне Таўлаю: у доме, у якім паэт жыў з 1939 па 1941 год, калі працаваў у мясцовай газеце, адкрыты мемарыяльны пакой.

У Нясвіжы з 1996-га даступная Кватэра-музей мастака Міхаіла Сеўрука, дзе можна пабачыць яго жывапісныя, графічныя работы, у тым ліку гравюры на дрэве, медзі, лінолеуме, а таксама асабістыя рэчы майстра — эцюднік, альбомы для замалёвак, пастэльныя алоўкі, пэндзлі, разцы. А ў экспазіцыі Германавіцкага музея культуры і побыту, што ў Шаркаўшчынскім раёне, захоўваецца мноства матэрыялаў, звязаных з біяграфіяй славутага Язэпа Драздовіча, а таксама некаторыя яго творы, напрыклад славутыя маляваныя дываны.

Адным з найбольш вядомых сімвалаў трагічнай гісторыі Заходняй Беларусі стаў канцэнтрацыйны лагер у Бярозе-Картузскай, заснаваны ў 1934 годзе. Сюды адпраўлялі тых, каго тагачасная польская ўлада лічыла "грамадска небяспечнымі элементамі", — у тым ліку і ўдзельнікаў барацьбы за ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Таму недарма да Дня народнага адзінства ў 2021-м у будынку Чырвоных казармаў, дзе размяшчаўся адзін з карпусоў лагера, была створана часовая, а годам пазней — і пастаянная музейная экспазіцыя. Тут сабраны фота і дакументы, транспаранты і ўлёткі, задакументаваныя ўспаміны і асабістыя рэчы вязняў, адноўлена абстаноўка камеры і карцара.

## ДА АГУЛЬНАЙ МАРЫ

Спадчына паэтаў і мастакоў Заходняй Беларусі прасякнута любоўю да роднай зямлі і агульнай мінуўшчыны народа. Яны бачылі і адлюстроўвалі Беларусь непадзельнай, без штучна праведзеных меж. Таму сёння важна захоўваць памяць аб гэтых творцах. Іх жыццёвыя і мастацкія шляхі хоць і былі поўныя нягод ды перашкод, але ўпэўнена вялі да здзяйснення агульнай мары ўсіх беларусаў аб уласнай адзінай дзяржаве.

**Антон РУДАК**